Болбас, В. С. Гістарычныя карані полікультурных напрамкаў адукацыі на Беларусі / [В. С. Болбас] // Нацыянальная адукацыя. – Кн. 7. – Брэст, 1996. – С. 3–5.

# ГІСТАРЫЧНЫЯ КАРАНІ ПОЛІКУЛЬТУРНЫХ НАПРАМКАЎ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ

Сучасная зацікаўленасць у развіцці полікультурных накірункаў зместу адукацыі мае пад сабой гістарычны падмурак. Ён быў закладзены яшчэ ў часы першапачатковага распаўсюджання хрысціянства, якое на землях Беларусі ў адрозненне ад іншых краін распаўсюджвалася паступова, не гвалтоўна, часта сінтэзуючы язычніцкія вераванні з пастулатамі новай рэлігіі. Такім чынам фарміравалася талерантнасць як вызначальная рыса генатыпу нашага народа і важная перадумова яго полікультурнай скіраванасці.

Геаграфічнае становішча Бедарусі на сумежжы некалькіх культур спрыяла развіццю такой арыентаванасці. Склаўшаяся ў далейшым шматканфесійнасць яшчэ больш паглыбіла і пашырыла адзначаныя тэндэнцыі. Кожная рэлігійная плыня імкнулася мець як мага большую сетку школ, для якіх былі ўласцівы значныя адрозненні ў змесце і арганізацыі навучання. Гэта прыводзіла да таго, што нават грамадска-культурная самасвядомасць беларускага народа ў адрозненне ад многіх іншых народаў ніколі не мела ў сабе маналагічнасці, а з самых яе асноў была з'арыентавана на дыялагічны характар, што таксама заўсёды спрыяла больш хуткаму далучэнню продкаў да дасягненняў іншых культур.

Характэрна, што полікультурная арыентацыя адукацыі і грамадска-педагагічнай думкі Беларусі найбольш яскрава праявілася ў часы Вялікага княства Літоўскага, асабліва ў перыяд найвышэйшага ўздыму айчынай культуры (XVI ст. – першая палова XVII ст.). "Залаты век" прадэманстраваў, што ўласны росквіт не толькі магчымы, а нават і павінен забяспечвацца праз плённае выкарыстанне культурных здабыткаў іншых народаў.

Слынныя мысліцелі Беларусі, у процівагу меўшаму падчас месца псеўдапатрыятызму, нацыянальнай пыхлівасці, засяроджвалі ўвагу на супрацоўніцтве з іншымі народамі. Трапна і вобразна пісаў аб гэтым знакаміты айчынны асветнік Саламон Рысінскі (канец XVI ст. – першая чвэрць XVII ст.): "Не ведаю якой асалодай родная зямля ўсіх вабіць, і не дазваляе аб сабе забыць...але, клянуся Гераклам, калі ёсць вельмі зручны момант вынесці ногі з гнязда і ўпрыгожаную дамашнімі пер'ямі галаву высукуць вонкі, хочаца насычанаму айчынным паветрам панюхаць і духу іншаземнага. Ці доўга мы будзем весці манастырскае жыццё, ці доўга, прывязаныя да гэтых вуглоў, будзем задавальняцца вучэннем амаль засоленым і завяленым?"[1].

Пасля таго, як з утварэннем ВКЛ нашы супляменнікі "прасеклі акно ў

Еўропу", айчынная культура атрымала значны дадатковы імпульс для свайго развіцця. Грунтуючыся на агульнаславянскіх культурных набытках часоў Кіеўскай і Полацкай Русі, адчуваючы жыватворны ўплыў ідэй Адраджэння і Рэфармацыі, нашы продкі здолелі так распарадзіцца меўшайся спадчынай і новымі набыткамі, што не толькі не страцілі самабытнай культуры, а ўзнялі яе на новы, больш высокі якасны ўзровень. З усяго духоўнага багацця іншых народаў на беларускай глебе прыжывалася, як правіла, тое, што адпавядала характару і патрэбам яе жыхароў. Продкі далі нам добры ўрок, паказаўшы, што зацікаўленасць у іншых культурах павінна быць абумоўлена ўнутранымі інтарэсамі, а не навязана звонку.

Этыка-педагагічная скіраванасць айчыннай грамадскай думкі, памножаная на маральна-духоўныя арыенціры хрысціянства, абумовіла першарадны інтарэс да пытанняў маральна-выхаваўчай дзейнасці. І у гэтым кірунку адказы на многія пытанні нашы супляменнікі таксама чэрпалі з набыткаў іншых культур.

Так, у 1589 г. знакаміты асветнік Беларусі Беняш Будны выдаў зборнік маральна-этычных вучэнняў старажытнасці "Апофегматы, то есть ясных и нравоучительных речей книги четыре". Сінтэзуючы філасофска-этычныя сэнтэнцыі з твораў Дыягена Лаэрцкага, Плутарха, Цыцэрона і іншых старажытных мысліцеляў, мадэрнізаваў іх у кантэксце рэалій сваёй эпохі і падкрэсліваў, што ў антычнай культуры ёсць каштоўнасці, якія не залежаць ні ад аднаго веравызнання і таму маюць агульначалавечую значнасць. Дзякуючы гэтаму, зборнік Б.Буднага на беларускіх землях быў надзвычай папулярны. Толькі ў XVII ст. ён вытрымаў 11 выданняў. Высока ацаніў гэтую працу Пётр І, які загадаў перакласці яе на рускую мову, пасля чаго яна шмат разоў перавыдавалася і ў Расіі.

У гэты час другі славуты педагог арыянскай школы ў Іўі Ян Ліцыній Намыслоўскі выдае спецыяльны вучэбны дапаможнік для школ 1-й ступені "Сэнтэнцыі, неабходныя для жыцця...". Туды ўвайшлі 225 павучанняў, як арыгінальных, так і часткова запазычаных з літаратурных набыткаў іншых народаў. Гэта быў практычна першы айчынны падручнік па этыцы і абапіраўся ён таксама на шматкультурныя дасягненні чалавецтва.

Такім чынам, сінтэз пастулатаў антычнай этыкі, у якой мысліцелі і грамадскія дзеячы Беларусі эпохі Адраджэння выдзеляюць "плоцевую" і сацыяльную каштоўнасці чалавечага жыцця, і раннехрысціянскай маралі, з яе ўзвялічэннем духоўна-маральных вартасцей чалавека, пры апоры на вопыт народнай педагогікі дазволіў ім стварыць прынцыпова новыя палажэнні этыка-педагагічнай канцэпцыі, што былі характэрныя для набліжаючайся эпохі. Дзякуючы гэтаму, дасягненні айчыннай педагагічнай культуры па асобных пытаннях былі на ўзроўні перадавых сусветных рубяжоў свайго часу.

Аналіз зместу адукацыі вучэбных устаноў Беларусі перыяду сярэднявечча таксама сведчыць аб ярка выражанай шматкультурнай арыентацыі.

Скіраванасць на вывучэнне дысцыплін, што ўтваралі знакамітыя "сем вызваленых навук" як дасягненне агульнаеўрапейскай культуры, спарадзіла на землях Бацькаўшчыны імкненне "уцыті всех наук" на розных мовах і далучаць навучэнцаў да дасягненняў многіх культур свету. Праваслаўныя, каталіцкія і пратэстанцкія школы на Беларусі ў якасці абавязковых дысцыплін уключалі ў свае вучэбныя планы вывучэнне лацінскай і грэчаскай мовы і літаратуры. У многіх школах, акрамя гэтага, вывучаліся польская, старажытнаяўрэйская, царкоўнаславянская, нямецкая і французская мовы.

Пры гэтым трэба выразна ўсведамляць, што далучэнне да заходнееўрапейскай культуры падчас арганічна перапляталася з нацыянальна-культурнай дыферэнцыяцыяй, а часам і стрымлівала працэс нацыянальнага развіцця.

Далейшая гісторыя нашай краіны наглядна прадэманстравала, што штучнае прымусовае ўвядзенне ў яе сацыяльнае жыццё элементаў іншых культур, няхай нават і роднасных, адмоўна ўплывае на нацыянальна-культурнае развіццё народа і часам можа істотна тармазіць многія працэсы ўдасканалення грамадства.

---

[1] Порецкий Я. Соломон Рысинский. Минск, 1983.